УДК 811.161.3'374

Д.В. Дзятко, дац., канд. філал. навук (БДПУ, г. Мінск)

# АКАДЭМІК Я.Ф. КАРСКІ І БЕЛАРУСКАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ

Яўхім Карскі адным з першых у айчыннай філалогіі звярнуўся да распрацоўкі тэарэтычных праблем лексікаграфіі. Так, трэці выпуск трэцяга тома «Белорусов» пад назвай «Художественная литература на народном языке» (Пг., 1922) адведзены разгляду зместавых асаблівасцей і мовы беларускіх выданняў XIX – пачатку XX ст., а таксама творчасці тагачасных пісьменнікаў. У гэтым жа выпуску змяшчаецца раздзел «Матэрыялы да слоўніка беларускіх пісьменнікаў апошняга часу», у якім Карскі падаў сціслую інфармацыю пра каласальную колькасць аўтараў пачатку XX ст. – больш за 200 асоб.

Яшчэ ў першым томе «Белорусов» вучоны звярнуў увагу на неабходнасць сістэматызацыі беларускай лексікі. На той час найбольш аб'ёмным зборам беларускай лексікі быў «Словарь белорусского наречия» І. Насовіча (1870 г.). Асноўнымі хібамі слоўніка Карскі лічыў яго непаўнату, перанасычанасць невыкарыстальнымі словамі, шматлікія тэхнічныя недахопы, рэгіянальны характар і інш. Таму заканамернымі падаюцца планы Карскага завяршыць сваё фундаментальнае даследаванне структуры беларускай мовы вялікім зборам яе лексікі ў дзвюх частках: акадэмік меркаваў укласці слоўнік жывой (дыялектнай) беларускай мовы і слоўнік старабеларускай мовы.

На жаль, здароўе, узрост і неспрыяльныя ўмовы для працы ў савецкай краіне не дазволілі ажыццявіць гэтую задуму вучонага. Але пры гэтым Карскі пакінуў дастаткова падрабязную праграму лексікаграфічнай працы, апублікаваную ў артыкуле «Что предстоит сделать по белорусскому языку и литературе?» у 1920 годзе ён лічыў неабходным адабраць беларускую лексіку з фальклорных і этнаграфічных зборнікаў Я. Чачота, П. Бяссонава, У. Дабравольскага, А. Дамбавецкага, а таксама з твораў беларускіх даўніх і сучасных пісьменнікаў. Атрыманы ў выніку словаспіс павінен быць дапоўнены моўнымі адзінкамі са «Словаря белорусского наречия» І. Насовіча (М., 1870) і «Смоленского областного словаря» У. Дабравольскага (Смаленск, 1914), а таксама з разнастайных лексічных падборак, якія захоўваюцца ў навуковых і адукацыйных установах.

Распрацоўкі Я.Ф Карскага ў галіне тэорыі і практыкі лексікаграфіі некалькі пазней былі выкарыстаны слоўнікавай камісіяй Інбелкульта пры падрыхтоўцы праектаў па сістэматызацыі беларускай лексікі.